Цэна асобнага нумэру 5 кап

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень**

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць проз вішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. | 20 чэрвеня 1913 г. | №. 24—25.

**У нядзелю 23 чэрвеня „Беларускі Музыкальна-Драматычны Кружок“ у Вільні ладзіць вялікае ігрышчэ „Сьвята Купалы“.**

*Вільня 20 чэрвеня.*

### Эміграція і танны павер.

Едучы поездам з Мінска на Лібаву усягды спаткаеш селян убраных па «цывільнаму»: дзяцюкоў, дзеўчат; гэта едуць у Амэрыку на заработкі. Цяперэшняй вясной народ моцна сыпнуў прадаваць свае сілы за Амэрыканскіе доляры. Напрыклад каля мястэчка Радашкавіч з вёсак ужо выехало больш сотні душ і гэтулькі сама ешчэ выбіраецца. У Лібаві сабраўшыся было нідаўна 2,650 душ „амэрыканцоў“ адразу. ім нехапало мейсца на караблёх.

З аднаго боку, як мы ужо пісалі у „Н. Н.“, з Амэрыкі плывуць да нас грошы, і селянскі капітал, што ляжыць у банчкох у большай сваей палавіне амэрыканскі, бо толькі меншая частка с селянскіх ніў і лясоў. А з другога боку Амэрыка забірае у нас лепшые рабочые сілы с каторых німалое чысло іх марнуецца у змаганьні «за доляр» бо, пры цяперэшніх варунках, яны ня могуць знайсці працы у нашым наагул багатым краю.

У нас, праўда, цяпер лягчэй можна зарабіць на харчы, на адзежу, а купіць добраго каня, насеньня, прыладу лепшую, зямлі, з заработкоў ня дужа купіш, калі патрэбны грошы на гаспадарку, на хату выежджаюць у Амэрыку. Прычына гэтаго у тым, што хаця сельская гаспадарка у нашым краю, за апошніе 7—8 гадоў, з году на год, паднімаецца, жыцьцё эканамічнае і патрэбы растуць, а парадкоў новых німа, не заводзяць і нет ведама калі завядуць; мы ўсё як той казаў, сядзім «пры разбітым карыці. У нас німа сельскагаспадарскай помачы, таннаго паверу на сельскую гаспадарку. Для утрыманьня рабочых рук на мейсцы апрача добрай рады трэба ешчэ і добрых рублёў. Цяпер у нас такіе варункі, што як трэба пазычыць грошы на гаспадарку то заплаці 12 працэнтоў, а калі уложыш іх у гаспадарку, то выбярэш 4—5 працэнтоў, ды ешчэ і грошы тых мала у банчкох, каб пазычаць на доўгі тэрмін, на якіх хоць 5 гадоў. Адным словам, хоць гаспадарка апошнімі часамі і што раз лепей аплачываецца, але калі на пад[illegible] ae сваіх грошы у гаспадара німа то і пазычыць іх дорога абходзіцца, бо німа правільна арганізаванаго паверу (крэдыту). Як відаць с казённых атчотоў, у нашым краю і у польшчы ёсць больш банчкоў і ідуць яны лепей, як у вялікарасеі, так што грошы ешчэ у нас можна знайсці, але яны за дарагі, пакуль што, тавар для сельскаго гаспадара.

Тут ізноў байку баяць трэба пачынаць с канца: прычына ўсяго гэтаго ляжыць у эканамічнай палітыцы гасударства. У казённых банках ёсць найбольш грошы, трэба. каб казна іх пазычала у хаўрусные банчкі за танны працэнт, тагды грошы стануць таней і у Амерыку па грошы ня трэба будзе высылаць свае лепшые рабочые сілы

А. У.

---

## Дарэмные страхі.

Колькі дзён таму назад у расейскай газэці *«Новое Время»* была надрукавана стацьця, каторая ясна паказала ўсім, куды кіруюцца і якую мэту маюць расейскіе націоналісты. У Расейскай дзержаве не павінна быць «ніякіх націй, ніякіх культур, апрача расейскай!» — клічэ „Нов. Вр.“ і дае раду правіцельству, як яно павінно зваеваць украінцоў: абвесьціўшы, што ўвесь украінскі рух — «государствено — преступный», значыць ідзе проці расейскай дзержавы, лавіць і высылать з Расеі назаўсягды ўсіх сяўцоў національнай сьведомасьці між украінцамі.

Гэтак націоналісты аткрылі свой твар і паказалі, хто яны. Ненавісць да ўсіх, хто гаворыць дома не парасейску, хто любіць сваю родную мову і свой народ ды клічэ другіх любіць і шанаваць іх,—гэта ненавісць забівае у націоналістоў усё *людзкае*, прымушае іх глядзяць на бліжняго, як на ворага. Націанальнае адраджэньне народоў — гэта вялікая і сьвятая справа. Народы будзяцца да новаго жыцьця, як той Лазар, каторы быў памёр і ўваскрос. Каб задзержаць Лазара у абоймах сьмерці, каб налажыць на народ, каторы рвецца да жыцьця, жалазные путы,—дзеля гэтаго патрэбны людзі, у каторых німа сумленьня. Гэткіе людзі і ёсць націопалісты.

«Нов. Вр.» пішэ, што украінскі рух дайшоў ужо вялікай сілы і зрабіўся «небаспечным» для Расеі. Але ў чым прычына таго страху? У тым, што украінцы чытаюць кніжкі і газэты па украінску, што маюць свае тэатры, навучные таварыствы, экономічны е організаціі, што гаворацць на своему ўсюду аткрыта. не саромяючыся і што вучаць у роднай мове дзетак сваіх,—адным словам, жывуць самі сабой, здавольваюча свое патрэбы сваім сіламі. Які-ж у гэтым „праступак“ якое „небаспечэнства“ ўсяе дзержавы?

Усюды на сьвеці гасударство цешыцца, калі бачыць, што народы, якіе ў ім жывуць, умеюць самі зрабіць сабе тое, чаго ім трэба. Ад гэтаго узмацовываецца і гасударство. У Расеі робіцца ўсё наадварот: націоналістычная палітыка кіруецца да таго, каб ніводзін народ ня жыў сам сабой, каб не разбіваўся і не узмацовываўся незалежне ад «пануючай націі».

Тое, што пішуць цяпер аб украінцах, „Вил. Вѣстн.“ і яго хаўрузія пісалі ўжо даўно аб беларускім руху, клічучы урад, каб ня даў нашаму народу ісьці сваей дарогай. І мы добра ведаем, ешчэ не раз Беларусы пачуюць на сабе цяжкую руку расейскіх націоналістоў, да слоў і рад каторых правіцельства пільна прыслухаецца. Але чыстая справа не баіцца насільства: раней ці пазней яна вызваліцца ад усялякаго уціску. І беларусы не павінны кідаць надзеі на лепшую будучыну: яна прыйдзе,—але прыйдзе тады, калі з усіх сіл сваіх будзем працаваць над будовай сваей культуры, калі кожын шчыры сын свайго народу панясе сьвет у цёмные куты беларускаго краю. Беларускае національнае адраджэньне —гэта работа ня жмені працаўнікоў на грамадзкай ніве, а ўсей вялікай грамады беларускай.

Мы не баімася страхоў і грозы расейскіх націоналістоў: народ збудзіўся, і вярнуць яго ў абоймы Сьмерці нельга.

А-н-а.

---

## Чужая мова.

На адным з апошніх заседаньнёў Гасуд. Думы. дэп. Бурьянов (соц. дэмократ), сказаў прамову проці таго, што па школах пачатковай навукі дзяцей вучаць у чужой мове. «Маю дакумэнты с харкоўскай губ.—казаў дэпутат—каторые сьведчаць што дзеці вучучыся веры па расейску дужа многа чаго саўсім не разумеюць.

Адзін хлапец здаючы лекцію з Новаго Закону, сказаў між іншым: „Хрысту не давалі есці“, а па кніжцы павінна было быць, што на Хрыста злаваліся.

Абмылка вышла с таго, што па украінску слова галадзіць каго, (не годувать) выгаварываецца так сама, як па расейску—злаваць.

Калі паглядзець што дзеецца у нас на Беларусі пры навучаньні веры па расейску і па польску, то не такіх ешчэ можна назбіраць кветачак. Узяць хоць-бы слова «благі», каторае азначае злы, нягодны па беларуску, а па славянску і па расейску наадварот—добры, найлепшы. Адзін законавучыцель расказываў нам, як цяжка дзецям растулмачыць значэньне гэтаго слова ужытаго у стасунку да Бога.

---

## Абмылка вучонага.

Сын лясвічаго, студэнт апошняго курса высокіх навук, прагуліваючыся у гарачы летні дзень па сенажаці каля рэчкі звярнуўся да пастуха Дзяніса, што сядзеў на купінцы ікажэ:

— Толькі селянін, жывучы між пахнючых лясоў і бязмерных зялёных палёў, бачыць праўдзівае хараство прыроды і можэ ў волю налюбавацца ім. Ці ўсходзе, ці заходзе сонцэ, ён першы прывітаецца з ім; ці разсцілаецца над возерам імгла, цалуючы зялёную травічку, ён першы спаткае і правядзе яе. А што-ж бачым мы жывучы у горадзе, сырые мураванные сьцены, дзень і ноч чуем грукатню калёс, і больш нічога, дрэўцэ дзе напаткаеш, і тое каравінькае, ведама расце с прымусу.

— Так то так, паночку, адазваўся Дзяніс, выбачайце даражэнькі, што памыкаюся у размову. Ня ведаю як там у горадзе, бо ніколі не давялося быць, а пра вёску ня ўцерплю скажу, што ведаю, калі толькі паслухаецц мяне простага мужыка... Што ніхто раней за селяніна ня зглядзіць калі ўстае і кладзецца сонцэ, гэта праўда, віхто так ні бачыць тэй цёплай і халоднай імглы як наш брат, тож праўда, а што нікога так скорынька ні ашчэпіць за шыю торба, як селяніна, гэта так сама жывая ні падробляная праўда.

— А чаму-ж,—спытаўся здіўлены студэнт.

— А вось, паночку, па парадачку, перш прадмову: абы нарадзіўся мужык, зараз сьледам голад, холад, хваробы, змагайся, калі жыць хочэш, а крыху прыжырхнуў, ну і будзеш спаць пакуль Міхал Арханёл ня ўзбудзіць ат сна. А калі так сяк пераківаўся і стаў на ногі, само жыцьцё дапаможэ і зробіць с цябе убогаго... Ці бачыця, паночку, вунь, вёску Млехава, хат с паўсотні на прыгорку стаіць. Так вось і мая там сялібінка калісь была, а цяпер ні кала ні двара, з гаспадара пастухом стаў, ганяю, як самі бачыця, чужы скот папіхач-дый толькі. Сядзеў як і ўсе на чужой зямліцы, рваўся, як мог, і туды і сюды нічога, што ні ўзгарусьціў чынш,—хвароба ў перазыўкі прыходзе, — адагнаў хваробу—нідарод падскочыў; змагаўся змагаўся, а нарэшця здаўся. Хоць страшэнна шчыміць сэрцэ усцомніўшы пра тую хвілю але каб пану было ведама бліжэй жыцьцё бяздольных нашых братоў, крану загоеную рану...

— Быў гарачы летні дзень, усе, як адзін, мы працавалі на сенажацях, скрозь заросшых высокай травой. Адпачынку не было а пагода служыла, ну і завіхаліся, каб барджэй скончыць, ды за жніво узяцца. У кожнаго працаўніка была думка узгарусьціць к восені хлеба, прызабыць на голад, аж бач не, — нешчасьце ціхачом падпаўзло і знішчыло ўсё на прах... Сонцэ захавалося за хмарку, крутануў вецер, падхапіў з дарогі пыл і загайсаў па полі. Замігацела маланка, пасыпаўся дожд з градам гракануў пярун і бура паперлася на лес, кладучы па дарозі векавые бярозы.

— Замоўклі людзі пахаваўшыся хто куды.

Ох шорхна ўспомніць тую хвілю, як развіднелося, Богу толькі ведама, Град скамечыў усё, што было на полі, бура параздзерала стрэхі, зруйнавала з зямлёй і папёрлася, як шалёная ў пушчу. Плач бяздольных селян разлегаўся дзень і ночь. Пашла гутарка па вёсках, што гэтак ня будзе, што аб нешчасці ведама ўсюды і не далей, як заўтра—пазаўтра, помач зьявіцца.

— Чэкаем, туляемся каля вуглоў, глядзім на дарогу; ніхто ня едзе ня йдзе, каму баліць галава аб чужой бядзе? Пражылі дзень пачалі другі аж бач поўднем падняўся гоман і народ гуртам паваліў к выгану.

Ну сабе мыслю, помач тут, ні дарма казалі калі пакараў Бог, людцы добрые руку пададуць. Падыходжу. Бачу каля Міронавай хаты стаіць шарабан запрэжэны пышнай паркай коней і нейкі пан з даўгой сівой барадой аглядае бяду і селян.

— Адліччa на грудзях і бліскуючые гузікі пераліваючыся на сонцы аж кідаліся у вочы.

— Здымаю шапку і прыслуховываюся. Плач крык енк глушаць вушы, Селяне бягуць, як вада, бабы цягнучы за сабою дзяцей, ажваляюцца спешучы к грамадзе, каб папасці на большую сямью большы куш.

— Хлапцы аглядалі магучую фігуру пана-

